## У ПАРТКОМЕ

На гэтым тыдні ў сераду адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта. Заслухана і абмеркавана пытанне «Аб кіраўніцтве партыйным бюро фізічнага факультэта дзейнасцю групы народнага кантролю». Выступілі сакратар партбюро названага факультэта Т. П. Жалонкіна і старшыня групы народнага кантролю С. С. Гіргель.

Інфармацыю аб ходзе выканання плана сацыяльна-эканамічнага развіцця універсітэта зрабіла загадчыца вучэбнай часткі Н. І. Папкова.

Загадчык кафедры навуковага камунізму У. І. Качаткоў праінфармаваў партыйны камітэт аб ходзе падрыхтоўкі да дзяржаўных экзаменаў па навуковаму камунізму.

Партыйны камітэт разгледзеў пытанне аб некаторых парушэннях пры забудове дач у садаводча-агародніх кааператывах і вызначыў меры па іх недапушчэнню.

*Камсамольскае жыццё*

# ПАВЫШАЦЬ АКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

У Справаздачным дакладзе ЦК ВЛКСМ XIX з'езду камсамола падкрэслівалася, што «камсамольскія арганізацыі павінны ўсім зместам сваёй работы фарміраваць у кожнага камсамольца, маладога чалавека актыўную жыццёвую пазіцыю, адкрываць для яго свет вялікага грамадскага жыцця».

Гэта задача асабліва актуальная ў рабоце са студэнцкай моладдзю. Пытанні ўдасканальвання нашай работы па развіццю грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў заўсёды павінны быць у полі зроку камітэтаў камсамола. З мэтай павышэння актыўнасці студэнтаў мы выкарыстоўваем такія добра зарэкамендаваўшыя сябе формы работы, як Ленінскі залік, грамадска-палітычная атэстацыя , агітпаход «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» і інш.

Ленінскі залік дазваляе павысіць грамадска-палітычную і працоўную актыўнасць студэнта. Акрамя таго, гэта форма дзейнасці забяспечвае індывідуальны падыход у рабоце з кожным членам ВЛКСМ.

Штогадовая грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку па выніках выканання імі комплексных планаў праводзіцца восенню на адкрытым камсамольскім сходзе вучэбнай групы. У лютым — сакавіку праходзіць прамежкавая атэстацыя, на якой разглядаецца ход выканання асабістага комплекснага плана па выніках першага семестра. Грамадска-палітычная атэстацыя камсамольскага актыву (бюро) групы праводзіцца на пасяджэннях факультэцкіх камісій, дзе адначасова разглядаецца выкананне комплекснага плана групы і даецца ацэнка работы камсамольскага актыву.

У ходзе грамадска-палітычнай атэстацыі камітэт камсамола ўдзяляе ўвагу ўзмацненню сацыяльнай актыўнасці не толькі камсамольца, але і калектыву, у якім ён выхоўваецца — камсамольскай арганізацыі групы. Мы ўважліва вывучаем прапановы і крытычныя заўвагі, якія потым абагульняем і рэалізуем.

Так, цяпер многія групы маюць калектыўныя даручэнні, а факультэцкія камсамольскія арганізацыі — канкрэтныя зоны дзеяння. Сістэма калектыўных даручэнняў уводзіцца па прапанове камсамольцаў фізічнага факультэта. Гісторыка-філалагічны факультэт вядзе вялікую работу па стварэнню Летапісу народнай славы Цэнтральнага раёна г. Гомеля. Біялагічны і геалагічны факультэты праводзяць прыродаахоўную работу ў горадзе. Фізічны факультэт — калектыўны шэф інтэрната № 3 г. Гомеля. Шмат новых цікавых спраў пачата ў нас менавіта па прапановах, выказаных камітэту камсамола ў ходзе Ленінскага заліку. Па ініцыятыве чацвёртакурснікаў фізфака (цяпер V курс) камсамольская арганізацыя ГДУ стала актыўным удзельнікам Маршу міру савецкай моладзі. Студэнты групы Г-21 гістфіла прапанавалі пачаць агляд-конкурс на лепшую камсамольскую групу па вывучэнню марксісцка-ленінскай тэорыі ў спалучэнні з апаратыўным палітычным інфармаваннем. Такім чынам, Ленінскі залік становіцца крыніцай новага ў камсамольскай рабоце і ўзбагачае яе змест цікавымі нефармальнымі формамі.

Для павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў камітэт камсамола выкарыстоўвае сістэму грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў— састаўной часткі Ленінскага заліку. Прывяду некалькі прыкладаў арганізацыі некаторых форм грамадска-палітычнай практыкі. На аддзяленні ФГП — прапагандыстаў экалагічнага напрамку мы даём неабходную тэарэтычную падрыхтоўку студэнтам біялагічнага і геалагічнага факультэтаў, многія з якіх уваходзяць у састаў Дружыны па ахове прыроды. Пасля праходжэння вучобы мы арганізуем прапагандысцкую работу рабят сярод школьнікаў і працоўных горада. На працягу года кожны прапагандыст вядзе заняткі з адной пэўнай групай слухачоў. Ужо на практыцы студэнты атрымліваюць навыкі прапагандыста. Многія групы эканамічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў атрымалі калектыўныя даручэнні: займацца на факультэце грамадскіх прафесій на аддзяленні прапагандыстаў для сістэмы камсамольскай палітычнай вучобы розных напрамкаў: эканамічны, маральны, палітычны і інш. Усе слухачы замацаваны за прадпрыемствамі, дзе яны будуць прымяняць атрыманыя веды на практыцы. А кожны студэнт мае вопытнага прапагандыста-кіраўніка, які дапамагае асвойваць навуку партыйнай прапаганды.

Трэба адзначыць, што ўдзел камсамольцаў у той або іншай грамадскай арганізацыі яшчэ не з'яўляецца праходжаннем грамадска-палітычнай практыкі. Галоўны яе змест — мэтанакіраваная выпрацоўка неабходнага студэнту ў яго будучай дзейнасці комплексу ведаў і навыкаў арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы ў калектыве.

Для павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў камітэт камсамола актыўна выкарыстоўвае Усесаюзны агітпаход «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!». Камсамольцы вядуць агітацыйна-масавую работу ва ўсіх раёнах вобласці, у школах. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, удзел у аперацыі «Памяць». Студэнты ГДУ выступаюць арганізатарамі многіх ваенна-патрыятычных і спартыўных мерапрыемстваў у горадзе і вобласці. У сельскіх дамах культуры выступаюць з канцэртамі студэнцкія агітбрыгады, праводзяцца святы моладзі.

Павышэнню грамадска-палітычнай актыўнасці студэнтаў будзе садзейнічаць таксама распрацаваная камітэтам камсамола праграма сумеснай работы з кафедрамі грамадскіх навук. Так, напрыклад, сумесна з кафедрай філасофіі мяркуем пачаць сацыялагічнае даследаванне «Лад жыцця студэнта». На аснове атрыманых вынікаў будуць дадзены практычныя рэкамендацыі з мэтай удасканальвання работы камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Зразумела, што нам яшчэ трэба шмат працаваць, каб выхоўваць ідэйна-загартаваных, адукаваных ва ўсіх адносінах спецыялістў. Цяпер, калі пытанні выхавання сталі цэнтрам ідэалагічнай барацьбы, якая ў апошні час рэзка абвастрылася, мы абавязаны самаадданна змагацца і выхоўваць у кожнага маладога чалавека высокую ідэйнасць, уменне з класавых пазіцый весці наступальную барацьбу з буржуазнай ідэалогіяй.

**В. ШЭВЕЛЕВА,**
**нам. сакратара камітэта ЛКСМБ па ідэалагічнай рабоце.**



□□

**На факультэце грамадскіх прафесій універсітэта студэнты набываюць другую спецыяльнасць — грамадскую. Яна спатрэбіцца ім у самастойным працоўным жыцці.**

**НА ЗДЫМКУ: на адным з падраздзяленняў ФГП заняткі са студэнтамі вядзе асістэнт кафедры навуковага камунізму В. В. Юфераў.**

Фота **У. Чысціка.**

□□

*У музеях універсітэта*

# І КАМЕНЬ ТРЭБА ЛЮБІЦЬ...

— Камень трэба любіць,— сказаў пры сустрэчы з намі загадчык кафедры мінералогіі, петраграфіі і геалогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, прафесар Валянцін Аляксандравіч Вахрушаў. — Не было б каменняў — не было б і Эрмітажа. Гэта ж з каштоўнейшых мінералаў вытачаны ў ім калоны. Ды што казаць! Пакуль існуе чалавецтва, будзе існаваць і геалогія...

Валянцін Аляксандравіч — аўтар васьмі манаграфій. Апошняя — «Рудныя мінералы вывержаных парод» — высока ацэнена ў друку. Чвэрць стагоддзя ён працаваў у Сібіры. Пяць гадоў працуе ў нашым універсітэце. Прафесар гаворыць, што нетры беларускай зямлі не бедныя на карысныя выкапні. Яны яшчэ чакаюць сваіх геолагаў.

Мы знаходзімся ў геалагічным музеі Гомельскага універсітэта. Яго дырэктар Міхась Іванавіч Аўтушка расказвае, што кожны камень, кожны мінерал, які трапіў сюды, прывезены з экспедыцый, з падарожжаў па роднай краіне. Нядаўна, напрыклад, студэнты-геолагі 5 курса пабывалі ў экспедыцыі «Па слядах акадэміка Ферсмана». Сярод іх былі Дзмітрый Аканішнікаў, Уладзімір Рылякоў, Вадзім Шахлянкоў, Кастусь Воронін і іншыя. Адтуль, дзе некалі праходзіў са сваёй экспедыцыяй Аляксандр Яўгенавіч Ферсман, яны прывезлі шмат каштоўных мінералаў.

Вось малахіт з азурытам і флюрытам. Адсвечвае зелянінай амазаніт. Гэты каштоўны камень прыгодны для вырабу падставак, чаш, падсвечнікаў. Пад шклом пераліваюцца ў святле электралямпы крышталі, кварцы. Шмат розных відаў слюды — маргарыт, калівая слюда, мускавіт... Цікава, што ў старажытнай Русі ў вузенькія акенцы падслепаватых хацінак устаўлялі шыбіны з мускавіта. Відаць, таму з-за мяжы і вярнулася назва ад слова «Масковія» — мускавіт...

Сапфір, рубіны, сердалік, горны крышталь, ярка-сіні лазурыт, аметыст... Цяжка пералічыць экспанаты геалагічнага музея.

— А вось гэтыя пліткі беларускага граніту і каляровага мармуру мы прывезлі з Мікашэвіцкага гранітнага кар'ера, — паказвае Міхась Іванавіч.

Багатая беларуская зямля і на карысныя выкапні. Соль калійная, галіт (каменная соль). Валянцін Аляксандравіч Вахрушаў гаворыць, што палавіну здабычы калійных соляў краіны прыпадае на долю нашай рэспублікі.

Прафесар паказвае нам жалезістыя канкрэцыі, паднятыя з дна Ціхага акіяна паблізу Гавайскіх астравоў. Чорныя шары, згусткі рэчыва, якое нават на далоні адчуваеш, як прыкметную вагу. Нядзіўна: канкрэцыі ўтрымліваюць нямала жалеза.

...Кавалак магнетыта. Яго прывезлі з гары Благадаць. У гэтым кавалку 70 працэнтаў жалеза. Поруч — тапазы, садаліт, апал, мінерал, тальк (ён бывае зялёнага, ружовага адценняў)...

Экспанаты універсітэцкага музея цікавяць не толькі тых студэнтаў, работа якіх будзе звязана з геалогіяй: нярэдка тут можна ўбачыць моладзь і з іншых факультэтаў — ім таксама хочацца больш ведаць пра гэту навуку.

Пры геалагічным музеі працуе школа юных геолагаў. Рабяты многіх школ горада бываюць тут. Яны вучацца любіць камені, каб потым, калі вырастуць, прайсці нязведанымі сцяжынкамі, і — хто ведае?— магчыма, адкрыюць новае месцанараджэнне карысных выкапняў...

**М. ДАНІЛЕНКА.**



НА ЗДЫМКУ: прафесар В. А. Вахрушаў са студэнтамі-першакурснікамі разглядае друзу горнага крышталю.

Фота студэнта завочнага факультэта ГДУ М. Высоцкага.

## ПРЫСВЕЧАНЫ КЛАСІКУ ЛІТАРАТУРЫ

100-годдзю з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка А. М. Талстога быў прысвечаны літаратурны вечар, які прайшоў днямі ў Палацы культуры будаўнікоў. Яго арганізавалі кафедра рускай літаратуры універсітэта, абласны драмтэатр.

Са словам пра А. Талстога на вечары выступіла кандыдат філалагічных навук А. К. Няронская.

Урыўкі з твораў А. Талстога гучалі са сцэны ў выкананні артысткі драмтэатра Н. А. Карнеевай.

Супрацоўнікі бібліятэкі ГДУ аформілі ў фае Палаца культуры выстаўку літаратуры, прысвечаную 100-годдзю класіка рускай літаратуры.

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

*Да 75-годдзя П. А. Дуброўскага*

# СТАРЭЙШЫНА ГЕОГРАФАЎ

15 студзеня споўнілася 75 гадоў з дня нараджэння Пятра Андрэевіча Дуброўскага, рэктара народнага універсітэта аховы і прапаганды помнікаў гісторыі і культуры ГДУ. Яго жыццёвы шлях насычаны шматлікімі падзеямі, адлюстроўваючымі біяграфію краіны, і можа быць прыкладам самаадданага служэння Радзіме, партыі, народу, справе выхавання моладзі.

З самага дзяцінства П. А. Дуброўскага вызначалі вялікая прага да ведаў, мэтанакіраванасць, рэдкая працаздольнасць. Больш за ўсё яго захаплялі геаграфія і настаўніцкая дзейнасць. Не выпадкова лёс прывёў маладога настаўніка ў адзін з буйнейшых універсітэтаў нашай краіны — Растоўскі-на-Доне, — які ён паспяхова закончыў у 1941 годзе.

...Адразу ж пачынаецца вайна. Пётр Андрэевіч па скарочанай праграме заканчвае артылерыйска-тэхнічнае вучылішча і ўключаецца ў барацьбу супраць гітлераўскіх захопнікаў. Ён удзельнічае ў баях на Бранскім, Сталінградскім, Данскім, 2-ім Украінскім франтах, камандуе ўзводам рэактыўных мінамётаў, якія наводзілі жах на фашыстаў. Смерць не аднаразова глядзела ў вочы мужнаму воіну. Але пасля шпіталяў ён зноў вяртаўся ў строй. Апошні раз Пётр Андрэевіч быў паранены пры вызваленні Венгрыі, дзе доўгі час на адным з помнікаў яго імя значылася сярод загінуўшых.

Ад сцен Сталінграда, дзе 40 гадоў таму назад Чырвоная Армія пачала разгром адборных фашысцкіх полчышчаў, да логава гітлераўцаў прайшоў цяжкімі франтавымі дарогамі Пётр Андрэевіч. Закончыў вайну ў званні капітана, за баявыя заслугі ўдастоены дванаццаці ўзнагарод.

Пасля дэмабілізацыі П. А. Дуброўскі зноў заняўся сваёй любімай педагагічнай справай.



Спачатку былы франтавік выкладае геаграфію ў адной з гомельскіх школ. Ён праяўляе сапраўдны талент педагога, заслугоўвае шырокі аўтарытэт, і яго прызначаюць дырэктарам СШ № 16. На педагагічнай ніве Пётр Андрэевіч становіцца заслужаным настаўнікам школы БССР, правадзейным членам Геаграфічнага таварыства БССР, вядзе вялікую работу як пазаштатны лектар абласной арганізацыі таварыства «Веды». І да яго баявых узнагарод дабаўляюцца яшчэ чатыры — за вялікія поспехі на мірным працоўным фронце.

Пенсійны ўзрост яшчэ доўга не перашкаджаў загартаванаму ў бітвах чалавеку спартыўнага складу выконваць нялёгкія абавязкі дырэктара школы і педагога. Але гады бяруць сваё...

Пятру Андрэевічу Дуброўскаму заслужана прызначылі персанальную пенсію рэспубліканскага значэння. Можна было і адпачываць. Але не такі характар у камуніста. Ён і дня не можа пражыць без справы. Пётр Андрэевіч прыходзіць у калектыў нашага універсітэта, змястоўна вядзе заняткі па эканамічнай геаграфіі на эканамічным факультэце. Адначасова працягвае актыўна ўдзельнічаць у рабоце Гомельскага аддзела Геаграфічнага таварыства БССР, з'яўляецца нястомным прапагандыстам ведаў. За год прачытвае не менш ста лекцый для насельніцтва Гомеля і вобласці. Тэматыка яго выступленняў — самая разнастайная: аб міжнародным становішчы, праблемах народанасельніцтва, ахове прыроды. Асаблівая дружба склалася ў Пятра Андрэевіча са студэнцкай моладдзю, перад якой ён часта выступае на тэмы ваенна-патрыятычнага выхавання, аховы і прапаганды помнікаў гісторыі і культуры.

Віншуючы Пятра Андрэевіча з брыльянтавым юбілеем, студэнты, выкладчыкі, увесь калектыў Гомельскага дзяржуніверсітэта жадаюць старэйшыну гомельскіх географаў, выдатнаму чалавеку, моцнага здароўя, актыўнага даўгалецця, новых поспехаў у яго нястомнай грамадскай дзейнасці.

**А. МАЛАХАЎ,**
**старшыня Вучонага савета Гомельскага аддзела Геаграфічнага таварыства БССР, дацэнт кафедры галіновых эканомік.**

**Ул. ПАШУК,**
**навуковы сакратар Гомельскага аддзела ГТ БССР.**

# НАВАТАР ЗААЛАГІЧНАЙ НАВУКІ

## Да 50-годдзя прафесара Б. П. Савіцкага



На наступным тыдні споўніцца 50 гадоў з дня нараджэння вядомага савецкага заолага, загадчыка кафедры заалогіі і аховы прыроды нашага універсітэта, доктара біялагічных навук, прафесара Барыса Парфёнавіча Савіцкага.

З самага дзяцінства захоплены біялогіяй, Б. П. Савіцкі паступае ў 1950 годзе на біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Ужо ў студэнцкія гады ён праяўляе цікавасць да навуковай работы, выконвае арыгінальныя даследаванні, якія былі адзначаны на рэспубліканскіх і Усесаюзных аглядах студэнцкіх навуковых работ.

Працоўную дзейнасць Б. П. Савіцкі пачаў яшчэ студэнтам. Ён сумяшчаў вучобу з работай выкладчыка біялогіі адной з сярэдніх школ г. Мінска. Пасля заканчэння універсітэта ён працягвае працаваць настаўнікам. Прага да навукова-даследчай работы прывяла Барыса Парфёнавіча ў Беларускі навукова-даследчы інстытут эпідэміялогіі і мікрабіялогіі. Тут Б. П. Савіцкі займаецца адным з важнейшых раздзелаў заалагічнай навукі—медыцынскай заалогіяй і паразіталогіяй. Пад кіраўніцтвам акадэміка АМН СССР В. І. Вацякова ён вывучае клешчавы энцэфаліт, прымае ўдзел у даследаванні ачагоў, распрацоўцы мер прафілактыкі гэтага захворвання ў Беларусі. Аснову навуковых інтарэсаў складаюць кровасосныя членістаногія — магчымыя ўдзельнікі цыркуляцыі віруса клешчавога энцэфаліту. Б. П. Савіцкі шмат працуе над вывучэннем біялогіі і эпідэміялагічнага значэння гэтых насякомых у Беларусі, праводзіць разнастайныя даследаванні па распрацоўцы мер барацьбы з імі. Вынікі яго даследаванняў публікаваліся ў цэнтральных выданнях, маюць важнае медыцынскае значэнне. Гэтай жа тэме прысвячалася і кандыдацкая дысертацыя Барыса Парфёнавіча, якую ён паспяхова абараніў у 1963 годзе.

Пэўны час Б. П. Савіцкі працаваў на Далёкім Усходзе, дзе арганізаваў параўнаўчае вывучэнне ачаговасці клешчавога энцэфаліту ў Хабараўскім краі, на Сахаліне і Камчатцы. Па выніках праведзеных даследаванняў Барыс Парфёнавіч у 1972 годзе абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара біялагічных навук.

З 1974 года Б. П. Савіцкі працуе загадчыкам кафедры заалогіі і дарвінізму нашага універсітэта. Тут з усёй паўнатой раскрыліся яго здольнасці як эколага шырокага профілю, арганізатара навуковых даследаванняў. Спалучэнне мэтанакіраванасці і шырокага кола навуковых інтарэсаў, здольнасць прыцягваць да работы моладзь, згуртоўваць вакол сябе навуковыя групы і калектывы, вялікая доля асабістага ўдзелу ў рабоце, уменне знаходзіць практычнае прымяненне тэорыі, — усё гэта ставіць Барыса Парфёнавіча Савіцкага ў лік вядучых заолагаў рэспублікі, дапамагае яму выконваць шэраг калектыўных даследаванняў па розных пытаннях заалогіі, экалогіі, аховы прыроды.

Па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам Б. П. Савіцкага пры ГДУ створана і паспяхова дзейнічае вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне «Фауна Палесся», якое каардынуе работу спецыялістаў 14 навуковых і практычных арганізацый рэгіёна. Ён з'яўляецца членам шэрагу саюзных і рэспубліканскіх каардынацыйных і праблемных саветаў, Вучонага савета па абароне кандыдацкіх дысертацый у Інстытуце заалогіі АН БССР. У г. Гомелі Б. П. Савіцкі кіруе міжгаліновым камітэтам па праблемах аховы акаляючага асяроддзя Гомельскага абласнога савета НТТ па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда Кампартыі Беларусі.

Шмат сіл і часу аддае вучоны прыродаахоўнай дзейнасці, прапагандзе ідэй аховы ў перыядычным друку, па радыё, на тэлебачанні. Ён — аўтар звыш 150 навуковых публікацый, шэрагу вучэбных праграм, інструкцый, метадычных указанняў, цэлай серыі папулярных артыкулаў, перадач па радыё і тэлебачанні. За поспехі ў працы, актыўную грамадскую работу Б. П .Савіцкі ўзнагароджан знакам «Ударнік дзесятай пяцігодкі», ганаровымі граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Цяпер юбіляр працуе над калектыўнай манаграфіяй, прысвечанай экалогіі вірусаў клешчавога энцэфаліту, закончыў працу над кнігай «Водныя і прыбярэжныя экасістэмы меліярацыйных каналаў Палесся. Жывёльны свет, прадуктыўнасць, санітарны стан, медыка-паразіталагічная характарыстыка і самаачышчэнні». Разам з калектывам супрацоўнікаў ён выношвае планы новых даследаванняў і экспедыцый.

Ад усёй душы жадаем юбіляру моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця, далейшых творчых поспехаў у развіцці савецкай заалагічнай навукі.

**КАЛЕКТЫЎ КАФЕДРЫ ЗААЛОГІІ І АХОВЫ ПРЫРОДЫ.**

# ПЕДАГОГ І ВУЧОНЫ

## ДА 50-ГОДДЗЯ ДАЦЭНТА Я. Е. ПАДУТАВА



Тыя, хто працаваў ці вучыўся ў 50-ыя гады ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, памятаюць сціплага, працалюбівага студэнта Яўгена Падутава, які ўвесь вольны час прысвячаў назіранням за птушкамі. Захапленне навукай, выдатная вучоба прывялі яго ў дзяржаўную запаведна - паляўнічую гаспадарку «Белавежская пушча». Тут, пасля заканчэння універсітэта, малады спецыяліст працаваў старшым навуковым супрацоўнікам, загадваў філіялам гаспадаркі на Выганаўскім возеры. Шматгадовыя назіранні за водаплаваючымі птушкамі возера «Выганаўскае» Яўген Емяльянавіч выклаў у кандыдацкай дысертацыі «Экалогія водаплаваючых птушак паўночна-заходняга Палесся» (1972 г.), асноўныя вывады і палажэнні якой знаходзяць прымяненне ў практыцы паляўнічай гаспадаркі па сённяшні дзень.

Любоў да моладзі, імкненне перадаць накопленыя веды будучым біёлагам прывялі Яўгена Емяльянавіча на педагагічную працу. З 1976 года ён — дацэнт кафедры заалогіі і аховы прыроды нашага універсітэта. У ГДУ Я. Е. Падутаў з энтузіязмам займаецца стварэннем заалагічнага музея, актыўна працуе ў комплексных навуковых экспедыцыях вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «Фауна Палесся», дзе займаецца распрацоўкай метадычных асноў аховы і рацыянальнага выкарыстання жывёльнага свету Палесся. Ён засвойвае выкладанне новага для універсітэтаў краіны курса «экалогія, біяцэналогія і ахова прыроды», кіруе адзіным у СССР факультатывам «таксідэрмія», чытае шэраг спецкурсаў заалагічнага профілю.

Камуніст Яўген Емяльянавіч Падутаў актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці факультэта. У цяперашні час ён — член Савета факультэта, намеснік старшыні групы народнага кантролю, выконвае іншыя даручэнні. Студэнты і супрацоўнікі факультэта паважаюць яго за працалюбства, сціпласць, выдатнае веданне сваёй справы. Многія карыстаюцца яго парадамі пры планаванні эксперымента, апрацоўцы навуковых вынікаў.

Юбіляр у росквіце сваіх творчых сіл. Ён завяршае працу над доктарскай дысертацыяй, з'яўляецца членам аўтарскага калектыву манаграфіі «Водныя і прыбярэжныя экасістэмы меліярацыйных каналаў Палесся».

**С. АЛЕШКА,**
**дэкан біялагічнага факультэта, дацэнт.**

**І. РАСАШКА,**
**дацэнт, старшыня прафбюро факультэта.**

**А. ЦІХАНСКІ,**
**партгрупорг кафедры.**

